■ Спорт-тайм

# ПРЫВІТАННЕ З ФРАНЦЫІ

## Пра стартавыя вынікі Еўра і каляфутбольныя навіны чэмпіянату

**Прэстыжны кантынентальны турнір набірае абароты, ужо прайшлі чатыры найцікавейшыя дні першынства. Чэмпіянат паспеў адзначыцца першымі скандаламі, чаканымі і не зусім вынікамі. Пачаўся святочным канцэртам на Марсавым полі, каля Эйфелевай вежы, а ўжо на наступны дзень прайшоў стартавы матч з удзелам зборнай — гаспадыні чэмпіянату, там французы былі мацнейшыя за румын — 2:1.**



У наступны гульнявы дзень турніру два матчы скончыліся з мінімальнай перавагай пераможцаў — зборная Швейцарыі абгуляла Албанію (1:0), а дэбютанты Еўра, футбалісты Уэльса, былі мацнейшыя за дэбютантаў са Славакіі (2:1). Трэці матч другога гульнявога дня быў куды больш цікавым і інтрыгуючым: там сустрэліся зборныя Расіі і Англіі. Англічане адкрылі лік першымі і доўга ўтрымлівалі перавагу, але сапернікі ў самым канцы сустрэчы зрабілі лічбы на табло роўнымі — 1:1. Менавіта гэты матч і стаў першым каляфутбольным скандалам чэмпіянату.

Сутыкненні паміж расійскімі і англійскімі фанатамі ў Марсэлі пачаліся яшчэ да пачатку футбольнай сустрэчы, працягнуліся і падчас матча, і нават пасля завяршэння гульні. Па некаторых звестках замежных СМІ, у сутычках пацярпелі 35 чалавек. Саюз еўрапейскіх футбольных асацыяцый (УЕФА) неадкладна адрэагаваў на падзеі і заявіў, што правядзе расследаванне ў дачыненні да Расійскага футбольнага саюза. У сваю чаргу прэзідэнт РФС Віталь Мутко заявіў, што расійскі бок, хутчэй за ўсё, будзе аштрафаваны УЕФА за паводзіны сваіх заўзятараў на трыбунах.

Наступны дзень чэмпіянату прайшоў куды спакайней, Харватыя перайграла Турцыю (1:0), Польшча была мацнейшай за Паўночную Ірландыю (1:0), а зборная Германіі не без праблем адолела каманду Украіны (2:0).

Учора ў рамках завяршэння першага тура ў групе D чэмпіён Еўропы каманда Іспаніі толькі напрыканцы гульні здолела забіць адзін гол у вароты зборнай Чэхіі. Ён і стаў пераможным. Ірландыя і Швецыя, якія адкрылі першы тур у групе Е, і мач Бельгіі і Італіі адбыліся пазней, і працягнулі супрацьстаянне ў гэтым квартэце.

Сёння дзень на Еўра абяцае быць не менш цікавым: у першым матчы згуляюць зборныя Аўстрыі і Венгрыі (18.05 па беларускім часе), працягне чэмпіянат супрацьстаянне футбалістаў Партугаліі і Ісландыі (21.55).

***Тым часам мы працягваем знаёміць вас з цікавымі фактамі чэмпіянату і яго ўдзельнікаў.***



• Самай маладой камандай Еўра з'яўляецца зборная Германіі, сярэдні ўзрост немцаў — 25 гадоў і 8 месяцаў.

• Самай «пажылой» лічыцца Ірландыя, сярэдні ўзрост там амаль 30 гадоў.

• Самымі высокімі з'яўляюцца шведы — сярэдні рост скандынаваў 1 метр 86 сантыметраў.

• Самая цяжкая каманда — зборная Германіі, сярэдняя вага крыху большая за 80 кілаграмаў.

• Самы малады футбаліст турніру — Маркус Рэшфард (зборная Англіі, выступае за клуб «Манчэстар Юнайтэд»), спартсмену ўсяго 18 гадоў.

• Самы ўзроставы гулец — варатар Габар Кіран (Венгрыя), яму 40 гадоў і 2 месяцы.

• Самым высокім на турніры з'яўляецца галкіпер Костэл Панцілемон (Румынія), яго рост 2 метры 3 сантыметры.

• Самым нізкарослым лічыцца атакуючы футбаліст Італіі Ларэнца Інсінье — 1 метр 63 сантыметры.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

# ПЕРШЫ КРОК ДА ПЕРАМОГІ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра барацьбу айчынных гандбалістаў за выхад у фінальную частку чэмпіянату свету 2017 года, пра выніке чарговага тура футбольнага першынства краіны і пра развязку сезона ў Нацыянальнай хакейнай лізе.**



***1. Нашы гандбалісты атрымалі першую перамогу на шляху да выхаду ў фінальную стадыю чэмпіянату свету — 2017.*** У дамашнім матчы на паркеце мінскага палаца спорту «Уручча» падапечныя Юрыя Шаўцова перамаглі зборную Латвіі — 26:24. Нашы суайчыннікі даволі ўпэўнена пачалі гульню і практычна ўвесь першы тайм вялі з перавагай у 2-3 мячы. Аднак бліжэй да перапынку гульня разладзілася, і госці дагналі беларусаў — 13:13. У другой палове сустрэчы сітуацыя для нас пагоршылася — за 10 хвілін да фінальнай сірэны каманда засталася без свайго капітана Сяргея Рутэнкі, які атрымаў чырвоную картку. Тым не менш у канцоўцы сустрэчы нашы гульцы здолелі перахапіць ініцыятыву і перамагчы.

*— Галоўнае, што мы выйгралі, хоць матч для нас складваўся даволі цяжка, — адзначыў на прэс-канферэнцыі* ***галоўны трэнер беларускай зборнай Юрый ШАЎЦОЎ.*** *— Я ўжо казаў, што латышы — добрая каманда, яны гуляюць у цікавы гандбол, што і прадэманстравалі ў Мінску. Госці пастаянна дыктавалі тэмп гульні, а нам не ўдалося навязаць ім свой. Той план, які мы хацелі ажыццявіць у дамашняй сустрэчы, у нас не атрымаўся. Адна з праблем гэтага вечара — занадта рана хацелі завяршаць атакі. Шмат не закінулі са зручных пазіцый. Тым не менш хлопцы праявілі характар і пры такой цудоўнай падтрымцы трыбун змаглі вырваць перамогу. Усё вырашыцца ў другой гульні.*

Самым выніковым у беларускай зборнай стаў Сяргей Рутэнка, на яго рахунку 10 ачкоў, лепшым гульцом сустрэчы прызнаны варатар Вячаслаў Салдаценка. Матч у адказ адбудзецца ўжо заўтра ў латвійскай Валміеры. Нагадаем, каб трапіць на планетарнае першынство ў Францыю, неабходна атрымаць перамогу па суме дзвюх сустрэч.

***2. У чэмпіянаце Беларусі па футболе сярод каманд вышэйшай лігі прайшлі паядынкі 11-га тура.*** Лідар першынства барысаўскі БАТЭ нечакана прайграў у Мазыры мясцовай «Славіі» — 1:2. Мінскае «Дынама» адолела ў сталічным дэрбі футбалістаў «Мінска» — 1:0. Салігорскі «Шахцёр» на сваім полі разграміў гасцей з бабруйскай «Белшыны» — 3:0. У Жодзіне «Тарпеда-БелАЗ» і «Іслач» разышліся мірам — 1:1. Футбалісты «Гарадзеі» на сваім полі былі мацнейшыя за калегаў з «Нёмана» — 2:1. «Слуцк» саступіў брэсцкаму «Дынама» — 0:1. «Нафтан» не змог адолець «Віцебск» — 1:2. «Граніт» з Мікашэвіч згуляў унічыю са сталічнымі «Крумкачамі» — 1:1.

Наступны тур пройдзе 19-20 чэрвеня.

***3. Вікторыя Азаранка захавала за сабой шостыя радок у абноўленым рэйтынгу ВТА.*** Лідзіруе там па-ранейшаму амерыканка Серэна Уільямс, другое месца займае іспанка Гарбін'е Мугуруса, на трэцяй пазіцыі размясцілася Агнешка Радваньска з Польшчы. Адзначым, што фіналістка турніру ў Мінску, які скончыўся на мінулых выхадных, Вера Лапко паднялася на 49 пазіцый і цяпер займае 592-е месца ў сусветным рэйтынгу.

***4. «Пітсбург» стаў чатырохразовым уладальнікам Кубка Стэнлі.*** У шостым матчы фінальнай серыі «пінгвіны» нанеслі паражэнне «Сан-Хасэ» — 3:1. Хакеісты з Пенсільваніі афармілі перамогу ў выніковым супрацьстаянні — 4:2.

Нападаючы пераможцаў канадзец Сідні Кросбі стаў уладальнікам «Кон Смайт Трофі», які ўручаецца самаму каштоўнаму гульцу розыгрышу Кубка Стэнлі. Капітан «пінгвінаў» набраў 19 (6 + 13) ачкоў у 24 матчах плэй-оф.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

# Далей без «Дняпра»

## Паралельна з чэмпіянатам Еўропы па футболе стартаваў розыгрыш Кубка Беларусі

**У 1/32 фіналу паміж сабой сустракаліся каманды першай і другой ліг, а таксама калектывы фізкультуры. Большасць з матчаў сенсацый не прынеслі, але два футбольных аматараў дакладна здзівілі.**

Магілёўскі «Дняпро», які зараз выступае ў першай лізе і ідзе сярод лідараў, нечакана прайграў у Калінкавічах мясцовай «Вертыкалі» — 1:2. Пераможны гол гаспадары забілі за пяць хвілін да завяршэння сустрэчы. А вось сталічны «Прамень», які таксама прадстаўляе другі дывізіён, не справіўся з ФК «Сянно», адной з лепшых каманд Віцебскай вобласці, і саступіў з даволі балючым лікам — 0:3. Сапраўдны ажыятаж выклікаў кубкавы матч у Альшанах, якія ў народзе называюць агурковай сталіцай краіны. На гэтым матчы ў Столінскім раёне прысутнічала амаль 2 тысячы чалавек! На вачах такой аўдыторыі мясцовая каманда «Прыпяць» не разгубілася і правяла неблагі матч з магілёўскім «Тарпеда». Але госці ўсё ж такі вырвалі перамогу. 0:1 — далей у розыгрышы ідуць аўтазаводцы. Што такое забіваць, вырашыў успомніць вядомы беларускі нападаючы Мікалай Рындзюк, які другі сезон узначальвае «Смаргонь». Галоўны трэнер выйшаў на замену на 81-й хвіліне і адправіў два мячы ў вароты «Вікторыі» з Мар'інай Горкі. Агульны лік 5:0 на карысць калектыву з Гродзенскай вобласці.

Прапануем вашай увазе астатнія вынікі кубкавых паядынкаў: СДЮШАР-МТЗ-«Сябар» (Мінск) — «Слонім» — 0:7, «Мантажнік» (Мазыр) — «Смалявічы СТІ» — 2:3, «Горкі» — «Хваля» (Пінск) — 1:5, «Клецк» — «Хімік» (Светлагорск) — 1:5, «Нёман-Агра» (Стоўбцы) — «Ашмяны» — 2:1, ЮАС (Жыткавічы) — «Орша» — 0:7, «Забудова-Буд» (Чысць) — «Ліда» — 0:1, «Рагачоў-МК» — «Баранавічы» — 2:7, «Асіповічы» — «Гомельчыгунтранс» — 1:2, «Маладзечна-ДЗЮСШ №4» — «Гомель» — 0:2, ДЮСШ ДСК (Гомель) — «Тарпеда» (Мінск) — 0:4.

Між іншым, ужо адбылося лёсаванне 1/16 фіналу: «Смалявічы СТІ» — «Віцебск», «Хімік» — «Слуцк», «Хваля» — «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна), «Зорка-БДУ» (Мінск) — «Гарадзея», «Тарпеда» (Мінск) — «Славія» (Мазыр), «Вертыкаль» — «Іслач» (Мінскі раён), «Нёман-Агра» — «Нёман» (Гродна), «Смаргонь» — «Граніт» (Мікашэвічы), «Орша» — «Мінск», «Ліда» — «Шахцёр» (Салігорск), «Сянно» — «Нафтан» (Навапалацк), «Тарпеда» (Магілёў) — БАТЭ, «Гомельчыгунтранс» — «Крумкачы», «Гомель» — «Дынама» (Мінск), «Баранавічы» — «Белшына» (Бабруйск), «Слонім» — «Дынама» (Брэст).

**Тарас ШЧЫРЫ.** *taras@zviazda.by*

■ Ну і ну!

# ДАГАВОР... З САМІМ САБОЙ

**Былы дырэктар ДУ «ЦСК «Нёман», з'яўляючыся дзяржаўным служачым, адначасова выконваў і іншую аплатную работу, а таксама заключаў сам з сабой дагаворы падраду па падрыхтоўцы поля (ачыстка ад снегу, нанясенне разметкі) для правядзення гульняў па міні-футболе, ажыццяўляў устаноўку і зняцце варот, прыборку тэрыторыі, праверку білетаў і пропускаў на стадыён, забяспечваў выкананне там нормаў правапарадку. Гэта, як адзначае Камітэт дзяржкантролю Гродзенскай вобласці, каштавала ўстанове 28,5 мільёна рублёў.**

Праверка выявіла, што памеры прэмій службовым асобам установ спорту ў шэрагу выпадкаў перавышаюць устаноўленыя заканадаўствам, выплачваюцца з некальскіх крыніц за дасягненне адных і тых жа паказчыкаў. Напрыклад, намеснікі дырэктара ДУ «ЦСК «Нёман» з перавышэннем службовых паўнамоцтваў выдавалі загады аб заахвочванні кіраўніка ўстановы — на агульную суму 74,5 мільёна рублёў. Аналагічным спосабам неабгрунтавана прэміравалі і цяперашняга дырэктара — на суму 60,6 мільёна рублёў.

Акрамя таго, выяўлены факты заключэння дагавораў падраду з фізічнымі асобамі, у тым ліку з дзецьмі цяперашняга дырэктара і яго намесніка, на выкананне работ па нанясенні разметкі, фарбаванні агарожы пры наяўнасці ў штаце ўстановы каля 20 ставак рабочага персаналу. Са штатнымі работнікамі заключаліся дагаворы на выкананне работ «па ажыццяўленні кантролю за нармальнай работай гандлёвых апаратаў», «выемцы і перадачы грашовых сродкаў з гандлёвых апаратаў у бухгалтэрыю». Усё гэта пацягнула неабгрунтаванае выкарыстанне 77,6 мільёна рублёў бюджэтных сродкаў.

Разам з тым калегія Камітэта дзяржкантролю Гродзенскай вобласці звярнула ўвагу і на тое, што існуючых умовы дзяржаўнай падтрымкі не стымулююць установы фізічнай культуры і спорту зарабляць уласныя сродкі і скарачаць памер бюджэтнай субсідыі. Дадзеныя ўстановы сваю матэрыяльна-тэхнічную базу выкарыстоўваюць неэфектыўна, не ўкараняюць новыя віды паслуг у сферы фізкультурна-аздараўленчай работы.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

■ Здарэнне

# АФІЦЫЯНТКА ЎПАЛА Ў ЛІФТАВУЮ ШАХТУ

**Такое здарэнне адбылося ў сталічнай кавярні «Неапаль» па вуліцы Бурдзейнага.**

Падчас разбору было ўстаноўлена, што жанчына 1987 года нараджэння заходзіла спінай наперад у кабіну грузавога ліфта з памяшкання кухні для транспарціроўкі сервіровачнага вазка ў банкетную залу на другім паверсе. Дзверы ў ліфт адчыняюцца ўручную, прычым, не фіксуюцца. Афіцыянтка не ўпэўнілася, што кабіна знаходзіцца на першым паверсе і ўпала ў шахту з вышыні чатырох метраў. Работнікам МНС давялося падымаць пацярпелую пры дапамозе насілак. Яна была шпіталізаваная з папярэднім дыягназам «пералом правага бядра, правага пляча, удары рознай ступені цяжкасці, падазрэнні на пералом пазваночніка». Стан работніцы кавярні цяжкі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*